УДК 930. (476)

*А.А. Савіч*

# КАМУНІСТЫЧНЫ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ 1920-х гг. І СТВАРЭННЕ КПЗБ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ ДЫСКУРС

Артыкул, падрыхтаваная на аснове шырокага круга гістарыяграфічных крыніц і архіўных дакументаў, прысвечаны аналізу працэсу навуковага даследавання гісторыі камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў і стварэння Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Аўтар пільную ўвагу звяртае на абумоўленасць камуністычнага руху жаданнем бальшавіцкага-камінтэрнаўскі сіл распаўсюдзіць і ўмацаваць свой уплыў у краі, удакладняе арганізацыйна-кадравыя і матэрыяльна-тэхнічныя аспекты адпаведных дзеянняў. Асаблівае значэнне ва ўсталяванні камуністычнага ўплыву ў сілу шэрагу прычын мела супрацоўніцтва КП(б )Б і Бунда, які пры садзейнічанні партыйна-дзяржаўных структур БССР перапраўляў у Польшчу сваіх членаў.

## Уводзіны

Беларускімі савецкімі гісторыкамі ў другой палове 1950-х – 1980-я гг. была праведзена значная навуковая праца па вывучэнні гісторыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі [28, с. 45–83]. Аднак пры тым, што КПЗБ надавалася авангардная роля ў «барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне», шмат якія бакі гісторыі дзейнасці партыі не атрымалі дастатковага аб’ектыўнага асвятлення. Гэта тычыцца і пытанняў разгортвання ў Заходняй Беларусі рэвалюцыйнага камуністычнага руху, стварэння КПЗБ, асвятленне якіх у савецкія гады залежыла ад грамадска-палітычнай сітуацыі ў БССР.

## Гістарыяграфія, крыніцазнаўчыя падставы і перспектывы вывучэння гісторыі камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гг.

У 1920-я гг. у друку БССР панавала думка аб наяўнасці трывалых камуністычных настрояў у Заходняй Беларусі як выніку абвастрэння сацыяльна-эканамічнага стану і жорсткай палітыкі прыгнёту Польшчы. Гэты тэзіс да нядаўняга часу ўспрымаўся як аксіёма, пры гэтым існавалі тэорыі «двухкарэннасці» і «аднакарэннасці» КПЗБ. Вядома, што пасля рэпрэсій у пачатку 1930-х гг. у адносінах да ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў беларускай гістарычнай літаратуры былі зроблены высновы пра тое, што КПЗБ, прымаючы ў свае шэрагі БРА цэлай арганізацыяй, зрабіла вялікую палітычную памылку: разам з часткай сапраўдна па-камуністычнаму настроеных элементаў у КПЗБ пралезла група буржуазных нацыяналістаў, якія ўступілі ў кампартыю з мэтай узначалення рэвалюцыйнага руху і разгрома яго знутры [8; 25, с. 265–266]. Таму з’явіўся тэзіс аб тым, што КПЗБ утварылася з арганізацый Кампартыі Польшчы (КПРП-КПП), якія праводзілі сваю працу ў буйных гарадах Заходняй Беларусі. Такім чынам, гэтак званая тэорыя «двухкарэннасці» КПЗБ, згодна з якой КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі і некаторых дробнабуржуазных нацыянальных арганізацый, абвяргалася [3, с. 3–4]. У хуткім часе ўсе беларускія дзеячы, у тым ліку члены КПЗБ, пасля яе роспуску ў 1938 г. сталі на старонках савецкага друку «ворагамі народа».

Аднак і пасля рэабілітацыі КПЗБ і БРА ў беларускай савецкай гістарыяграфіі стварэнне КПЗБ падавалася спрошчана, схематычна і павярхоўна: «Ажыццяўляючы рашэнні II з’езда, ЦК КПРП склікаў у канцы кастрычніка 1923 г. у Вільні нелегальную канферэнцыю з прадстаўнікоў усіх існаваўшых на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Віленскай вобласці акруговых і гарадскіх партыйных камітэтаў, на якой і было прынята рашэнне аб стварэнні Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і абраны яе Цэнтральны камітэт. Гэта і была першая ўстаноўчая канферэнцыя, якая афарміла стварэнне

КПЗБ... У КПЗБ у канцы 1923 г. улілася Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА)». Пры гэтым, намякаючы на значнасць праблемы, аўтары гаварылі аб стане беларускага нацыянальнага руху: «Агульная абстаноўка рэвалюцыйнага ўздыму ў Польшчы і абвастрэнне партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі аказалі моцнае ўздзеянне на фарміраванне палітычных поглядаў беларускай інтэлігенцыі і дзеячаў дробнабуржуазных партый і арганізацый, якія групаваліся вакол Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні» [27, с. 69–71].

Навейшыя айчынныя даследаванні па гісторыі Заходняй Беларусі асаблівую ўвагу звяртаюць на абумоўленасць камуністычнага руху ў краі жаданнем бальшавіцка-камінтэрнаўскіх колаў стварыць падкантрольныя падпольныя групоўкі, якія б забяспечвалі адпаведны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё Польшчы [28, с. 174–177]. Пытанні ўнушальнай арганізацыйна-кадравай (перакід на кіраўнічыя пасады ў КПЗБ грамадзян БССР, навучанне кадраў у школе КПЗБ), матэрыяльна-тэхнічнай (дзейнасць друкарні КПЗБ, выданне падпольнай літаратуры, перакід зброі і да т.п.), фінансавай (дапамога сродкамі як БССР, так і Масквы) падтрымкі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі сістэматызавана і абгрунтавана прадстаўлены ў кандыдацкай дысертацыі В.М. Цынкевіча [34]. Дакументы айчынных архіваў, у першую чаргу Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, пацвярджаюць і ўдакладняюць працэс арганізацыі і забеспячэння камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі, дэталююць асобныя бакі адзначаных аспектаў.

Верагодна, у імкненні бальшвіцкіх колаў стварыць КПЗБ вырашальнае значэнне мела эвалюцыя палітычных поглядаў беларускіх дзеячаў. Польская дзяржава не перашкаджала дзейнасці беларускіх партый і арганізацый: у Вільні і Варшаве дзейнічалі Беларускія нацыянальныя камітэты, а ў выніку выбараў у 1922 г. быў створаны Беларускі пасольскі клуб – першае ў гісторыі Беларусі беларускае легальнае прадстаўніцтва ў парламенце, утворанае ў выніку законнага волевыяўлення беларусаў на ўсеагульных выбарах. Бальшавікі разумелі, што інтэграцыя беларускай палітычнай эліты ў польскую палітычную сістэму, а ўслед за гэтым Заходняй Беларусі ў польскую дзяржаву, паставіць пад сумніў перспектывы далучэння краю да БССР і СССР. Таму неабходна было тэрмінова арганізоўваць падкантрольную Мінску і Маскве заходнебеларускую камуністычную партыю, якая забяспечыла б выгляд наяўнасці ў Заходняй Беларусі «партыі дыктатуры пралетарыяту». І хоць навейшая польская гістарыяграфія вуснамі А. Сляшынскага гаворыць, што ў пачатку 1920-х гг. «паўночна-ўсходнія землі маладой польскай дзяржавы мусілі быць полем дзейнасьці КРПП», справа распаўсюджвання і замацавання камуністычнага ўплыву на абшарах Заходняй Беларусі не мела такой адназначнасці, бо, як адзначыў сам польскі гісторык, «там надалей заставалася тайная арганізацыя расейскіх бальшавікоў» [30, с. 121], філіял якіх – КП(б)Б – мела жаданне і арганізацыйныя магчымасці ўсталявання камуністычных груповак, падкантрольных Мінску.

Вядома, што дзейнасць камуністычных партый у Еўропе кантралявалася і накіроўвалася з Масквы Камінтэрнам, пра што пераканаўча сведчаць навейшыя публікацыі па гісторыі Камінтэрна [7; 12; 24; 33]. Што да Заходняй Беларусі, то сюды пасля няўдалай польска-савецкай вайны бальшавіцкае кіраўніцтва па лініі ваеннай разведкі, ДПУ і Камінтэрна ажыццяўляла актыўную перакідку сваіх давераных асоб, якія павінны былі, па-сутнасці з нуля, ствараць камуністычныя ячэйкі, наладжваючы сувязь з мясцовым насельніцтвам. Дакументы польскіх спецслужбаў утрымліваюць вялікую колькасць інфармацыі пра наяўнасць у пачатку 1920-х гг. у «прыгранічным пасе» патаемных камуністычных арганізацый, падкантрольных савецкім органам. Не меншую цікавасць выклікаюць дакументы савецкіх партыйна-дзяржаўных устаноў, якія непасрэдна займаліся перапраўкай сваіх агентаў на тэрыторыю Польшчы: у прыватнасці, аддзелаў КП(б)Б (Польбюро, Бюро нелегальнай работы, Сакрэтнага аддзела Цэнтральнага бюро),

Прадстаўніцтва КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, АДПУ Беларусі, палітычнага і разведвальнага ўпраўленняў Заходняга фронту. Інфармацыя, якая змяшчаецца ў такога кшталту дакументах, дазваляе па-новаму зірнуць на гісторыю камуністычнага руху Заходняй Беларусі пачатку 1920-х гг.

Савецкая гістарыяграфія сцвярджала, што камуністычныя настроі былі натуральнай з'явай грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі. Аднак ёсць дакументы, якія выяўляюць механізм і сродкі ажыццяўлення мерапрыемстваў па фінансаванні і арганізацыйным забеспячэнні працэсу штучнага стварэння камуністычнага асяродку і мясцовых арганізацый у Вільні, Беластоку, Брэсце, Гродна ў выніку актыўнай перакідкі камуністычных элементаў у Польшчу і Заходнюю Беларусь з БССР і СССР, у тым ліку па лініі разведкі 16 арміі [16, арк. 27]. Такім чынам, камуністычны рух фактычна ствараўся савецкімі партыйнымі і вайсковымі органамі.

Складанасцю арганізацыі пракамуністычнага рэвалюцыйнага руху на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў была праблема суперніцтва паміж беларускімі, польскімі і літоўскімі камуністамі, у тым ліку па пытанні дзяржаўнай прыналежнасці Вільні і Віленскага краю [29]. На фоне імкнення польскіх камуністаў замацаваць за сабой тэрыторыю Заходняй Беларусі можна гаварыць пра актывізацыю пракамуністычных сілаў, якія ў якасці цэнтра камуністычнага руху бачылі Мінск, а не Варшаву. Характэрным з'яўляецца той факт, што ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь дакументы за 1921–1922 гг., якія ілюструюць працэс стварэння камуністычнага асяродку ў Брэсце, Беластоку, Вільні, згрупаваны па справах, у назвах якіх маюцца фармулёўкі «Брэсцкая арганізацыя КП(б)Б», «Беластоцкі акруговы камітэт КП(б)Б» [15; 16]. Прынцыпова трэба адзначыць тое, што за ўплыў на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбывалася вострае канкурэнтнае суперніцтва паміж КПРП-КПП і КП(б)Б, якія на месцах праз сваіх агентаў стваралі камуністычныя асяродкі, выкарыстоўваючы камуністычныя сродкі Варшавы ці Мінска, ажыццяўлялі агітацыю сярод мясцовага насельніцтва. Наяўныя дакументы даюць падставы гаварыць, што ў заходнебеларускіх гарадах, напрыклад, Брэсце, існавалі ідэйна і нацыянальна разрозненыя камуністычныя арганізацыі і дзеячы, а значыць, рашэнне II з'езда КПРП аб стварэнні КПЗБ было кампрамісам, якога ўдалося дасягнуць пасля некалькіх гадоў суперніцтва паміж рознаскіраванымі пракамуністычнымі рэзідэнтурамі, адна з якіх ішла з Мінска, а другая з Варшавы [16, арк. 22, 23, 25–27]. Пры гэтым камуністычныя дзеячы з Мінска звярталі ўвагу на неабходнасць агітацыі сярод мясцовага сельскага насельніцтва – беларусаў, у той час як «варшавякі» грэбавалі гэтай справай. Таму, відавочна, стварэнне КПЗБ як складовай часткі КПП трэба разглядваць як перамогу польскіх камуністаў і няўдачу беларускіх камуністычных дзеячаў.

Ажыццяўляючы вырашэнне складаных пытанняў перакідкі ў Польшчу сваіх агентаў, адпаведныя структуры КП(б)Б сутыкаліся з праблемай кадравага забеспячэння як функцыянавання «дарог», так і насычэння камуністычнага падполля надзейнымі асобамі. У пачатку 1921 г. шырока выкарыстоўвалася платная дапамога кантрабандыстаў – «спекулянтаў», як іх называюць наяўныя дакументы. Яны не толькі дапамагалі ажыццявіць пераход савецка-польскай мяжы, але перапраўлялі неабходныя для падполля лісты, грошы, літаратуру – «бібулу». Аднак з цягам часу выявілася недобрасумленнае стаўленне «спекулянтаў» да выканання дамоўленасці (як паведамляў адзін з актывістаў Брэсцкага камуністычнага падполля, «трэба парваць усякую сувязь са спекулянтамі ў справе транспарту і праезду людзей. Мне прыйшлося чуць, што яны нярэдка спальваюць літаратуру на мяжы…» [16, арк. 10]) і надзвычай высокія кошты за адпаведныя паслугі, якія ўзрасталі (восенню 1923 г. за сем перапраўленых «літоўскіх таварышаў» трэба было выплаціць 140 даляраў, а ўвосень 1925 г. «патрабавалі па 170 даляраў за чалавека» [18, арк. 16; 20, арк. 4]. Таму яшчэ 9 красавіка 1921 г. на пасяджэнні Замежнага бюро КП(б)Б было прынята рашэнне: «1. Аб сувязях са спекулянтамі. Бюро, разуме-

ючы, што яны могуць нашкодзіць рабоце, …аказваючы ім садзеянне ў спекуляцыі, гэта адбіваецца на нашы органы, пастанавіла: сувязь са спекулянтамі парваць …3. Аб транспарце. Прымаючы за ўвагу, што Бюро пастанавіла парваць сувязь са спекулянтамі, якія дапамагалі ў транспартаванні літаратуры, пастаноўлена закупіць коней і вазы для ўладкавання свайго транспарту» [14, арк. 3]. Аднак канчаткова адмовіцца ад паслуг «спекулянтаў» не ўдалося, пра што сведчыць прыведзеная вышэй інфармацыя.

Яшчэ больш складанай была праблема падбору кандыдатур для перапраўкі на падпольную работу ў Польшчу. Выхадцаў з заходнебеларускіх абшараў, вопытных і праверaных кмуністаў, якія б, як, напрыклад, ураджэнец Берасцейшчыны С. Дубовік, ведалі мясцовую спецыфіку, мелі больш шанцаў адаптавацца да ўмоў падпольнай работы і выконваць заданні цэнтра, не хапала. Таму прыйшлося дамаўляцца з саюзнікамі па сацыялістычным лагеры – беларускімі сацыялістамі, у першую чаргу з эсэрамі, а таксама з Бундам, Паалей-Цыён і Яўрэйская камуністычнай партыяй. Беларускія эсэры з левага флангу БПС-Р, многія з якіх былі звязаны з Мінскам канспіратыўнымі сувязямі (А. Канчэўскі атрымліваў ад У. Ігнатоўскага ўласнаручныя лісты, а Л. Родзевіч пасля пераходу мяжы заявіў сябе супрацоўнікам ДПУ [15, арк. 54; 34, арк. 72]), з цягам часу арганізавалі БРА, якая садзейнічала новастворанай КПЗБ прыдаць беларускі каларыт.

Складаная кадравая сітуацыя падштурхоўвала КП(б)Б да супрацоўніцтва з Бундам, а фактычна да арганізацыйнага ажыццяўлення і фінансавання перакідкі бундаўцаў на тэрыторыю Польшчы, спадзяючыся на іх наступны ўдзел у падкантрольным Мінску падпольным пракамуністычным руху. Вядома, што член Польбюро ЦК КП(б)Б А. Славінскі ў лютым 1921 г. звяртаўся ў ЦК Бунда з просьбай дазволіць некаторым бундаўцам выконваць канспіратыўную працу на карысць беларускай кампартыі [17, арк. 7]. Да таго ж бундаўцы, гаворачы пра сумеснае ажыццяўленне планаў саветызацыі Польшчы, вялі з КП(б)Б тонкую гульню, намерваліся выкарыстойваць яе арганізацыйныя і фінансавыя магчымасці, жадалі ажыццяўляць у Польшчы самастойную палітычную лінію. Функцыянер Бунда Бляхер напрыканцы свайго ліста «з камуністычным прывітаннем» выказаўся А. Славінскаму: «Не адмоўце ў выдачы двух пропускаў праз дэмаркацыйную лінію двум асабістым супрацоўнікам, аб якіх я Вам гаварыў. Усяго найлепшага, да пабачэння ў Савецкай Польшчы» [17, арк. 8]. Паміж КП(б)Б і Бундам ішлі перамовы аб супрацоўніцтве на тэрыторыі Польшчы. На пасяджэнні Замежнага бюро 9 красавіка 1921 г. І. Ашаровічу даручалася «дамовіцца з Бундам адносна высылкі ў Польшчу накіроўваемых імі людзей, да атрымання вынікаў перагавораў пакінуць пытанне аб высылцы бундаўцаў адкрытым». На гэтым жа пасяджэнні адносна Яўрэйскай камуністычнай партыі, верагодна, з-за яе схілення да сіянізму і намагання дыстанцыянавацца ад нелегальнай рэвалюцыйнай працы, было «пастаноўлена не аказваць ім ніякага садзейнічання ў перапраўцы іх людзей» [17, арк. 3адв.].

Характэрным быў зварот ЦК Бунда з просьбай «у мэтах умацавання колькасці актыўных партыйных работнікаў камуністаў у шэрагах Бунда ў Польшчы …забяспечыць неабходнымі дакуентамі і садзейнічаць пры пераходзе дэмаркацыйнай лініі таварышам: Х. Граф і Ш. Фрыдман». Увогуле бальшавіцкае кіраўніцтва было зацікаўлена ў наладжванні ўваходжання Бунда ў Камінтэрн, таму адгуквалася на просьбы аб перапраўцы бундаўцаў у Польшчу, напрыклад, Т. Канеля, які «па даручэнні Цэка «Бунда» вязе сакрэтныя дакументы для маючага адбыцца з’езда «Бунда» ў Польшчы ў сувязі з яго ўступленнем у Камінтэрн» [17, арк. 13, 23].

Таму пашыранай з’явай узаемаадносін паміж дзвюма партыямі былі частыя лісты ЦК і абласнога камітэта Бунда ў Польбюро КП(б)Б з адпаведнымі зваротамі. Так, 8 лютага 1921 г. Беларускі абласны камітэт Бунда накіраваў у Цэнтральнае бюро КП(б)Б просьбу падтрымаць т. І. Сукеніка, які камандзіраваўся для падпольнай партыйнай працы ў Польшчу, пры пераходзе дэмаркацыйнай лініі і забяспечыць яго адпаведнымі

дабротамі і сродкамі. 22 сакавіка 1921 г. ЦК Бунда звярнуўся ў Польбюро з просьбай аказаць садзейнічанне пры пераходзе праз мяжу Г. Штука-Беккерскунсту і П. Мінцу, выезд якіх «з'яўляецца тэрміновай неабходнасцю з-за таго, што ў бліжэйшы час адбудзецца з'езд Бунда ў Польшчы». На функцыянераў з Польбюро, канешне ж, рабіла адпаведнае ўражанне тое, што дадзеныя бундаўцы накіраваны ў Польшчу «для адказнай партыйнай работы сярод яўрэйскіх рабочых». 9 красавіка 1921 г. Польбюро атрымала паведамленне пра тое, што І. Фінк і П. Разенблюм камандзіруюцца ў Польшчу для нелегальнай партыйнай работы і просьбу адправіць «у першую чаргу і забяспечыць іх дакументамі і грашыма». Такога кшталту звароты тычыліся перапраўкі ў Польшчу Х. Дваржэцкага, З. Кругляка, Л. Сталярчыка, Ферэра і іншых. Мелі месцы звароты, у якіх выстаўляліся цэлыя спісы па 10, 11, 16 чалавек бундаўцаў, якіх трэба было пераправіць праз мяжу [17, арк. 15–19].

Аднак спадзяванні на шчырае супрацоўніцтва з Бундам не апраўдвалі сябе: гэтая партыя ў асноўным стаяла на пазіцыях легальнай парламенцкай дзейнасці. Да таго ж левае крыло Бунда ў 1922 г. выдзелілася ў самастойную арганізацыю – Камбунд, які арыентаваўся на Варшаву і ў 1923 г. уліўся ў КПРП. Таму не дзіўна, што яшчэ вясной 1921 г. з Заходняй Беларусі па канспіратыўных каналах ад асоб, якія былі упаўнаважаны праводзіць наладжванне камуністычнай працы, у Мінск паступалі просьбы ад асцярожным стаўленні да бундаўцаў, якія перасылаюцца ў Заходнюю Беларусь. У прыватнасці, даклад і апытанне ў пачатку мая 1921 г. Косавай-Эстэр (верагодна, Р.Д. Вольф. – *А.С.*) выявіла фактычную адсутнасць камуністычнай арганізацыі ў Брэсце («ніякага ўплыву на масы няма з-за адсутнасці арганізацыі»). Да таго ж Косава-Эстэр перадала настойлівую просьбу «таварышаў» з Беластока і Брэста «не палягчаць прыезд у Польшчу розных бундаўцаў, хаця б і левіцы, бо пасля іх прыезду на месца яны становяцца крайнімі правымі бундаўцамі і істотна вельмі тармозяць камуністычную працу і шкодзяць ёй» [16, арк. 25]. Іншая невядомая асоба ў сваёй аналітычнай справаздачы аб становішчы на Берасцейшчне перадавала аналагічную просьбу: «Таварышы просяць не садзейнічаць праезду за кардон бундаўцаў і паалей-цыяністаў, як элемента, шкоднага для працы» [16, арк. 25].

Тым не меней пэўныя падставы для ўзаемадзеяння паміж партыямі на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі ўсё ж такі закладзены. У практыцы арганізацыі партыйнага жыцця камуністам трэба было пашыраць свае сувязі і ўплыў у рабочым асяродку. Паколькі сярод рабочых пераважалі яўрэі, то трэба было наладжваць узаемадзеянне з яўрэйскімі партыямі, у першую чаргу з Бундам, тым больш, што і КПЗБ, і Бунд пазіцыянавалі сябе як партыі рабочых. Да таго ж на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гг. сярод бундаўскіх арганізацый былі моцныя пазіцыі бальшавікоў [13, арк. 54], а гэта было непасрэднай перадумовай для супрацоўніцтва Бунда і КПЗБ ці выкарыстання камуністамі магчымасцей бундаўскіх арганізацый.

Пытанне ўзаемадзеяння камуністычных і бундаўскіх арганізацый заслугоўвае асобнага даследавання; прыклады супрацоўніцтва паміж камуністамі і бундаўцамі пацвярджаюцца архіўнымі дакументамі, у прыватнасці, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці. У архіве захоўваецца, як вядома, вялікая колькасць судовых спраў на ўдзельнікаў камуністычнага руху. Цікава, што некаторыя з выкрытых паліцыяй камуністаў, паводле аператыўна выяўленай інфармацыі, мелі шчыльныя кантакты з бундаўскімі арганізацыямі. Так, напрыклад, 17.X.1924 г. каменда дзяржаўнай паліцыі Сарненскага павета «вельмі пільна» паведаміла акруговаму кіраўніцтву дзяржпаліцыі ў Брэсце над Бугам, што Трахтэр Іцка асуджаны за прыналежнасць да камуністычнай партыі. Сарненская экспазітура дзяржаўнай паліцыі правяла па гэтай справе разбіральніцтва, з якога вынікае, што І. Трахтэр, які пражываў у Дубровіцы і знаходзіўся пад наглядам паліцыі, меў кантакт з камуністычнай арганізацыяй у Пінску і з членамі Бунда ў Дубровіцы і Столі-

не. Быў затрыманы 14.X.1924 г. у падазрэнні ў камунізме. У справе фігуруе нейкі Мейер Швец, затрыманы 08.01.1924 г. з-за падазрэння ў распаўсюджванні камуністычных адозваў. Расследванне супраць І. Трахтэра было спынена, а супраць Мейера Швеца адкладзена з-за таго, што апошні ў 1925 г. уцёк да Савецкай Расіі і там, верагодна, прыбываў [5, арк. 1, 30–31, 37]. Па падазрэнні ў камуністычнай дзейнасці праходзілі іншыя члены бундаўскай арганізацыі, напрыклад, Слуцкая Райза, Байгель Ёзэф-Хаім і Слуцкі Ёзэф, якія фігуравалі ў справе распаўсюджвання камуністычных адозваў у Дубровіцы 28.X.1924 г. Было ўстаноўлена, што названыя асобы належалі да партыі «Бунд». Ці бралі яны ўдзел у распаўсюджванні адозваў, не ўстаноўлена.

Фактам камуністычна-бундаўскага супрацоўніцтва была занепакоена каменда дзяржаўнай паліцыі Сарненскага павета, якая 26.XI.1924 г. канфідэнцыйна паведамляла акруговаму кіраўніцтву дзяржаўнай паліцыі ў Брэсце аб тым, што ў Дубровіцах акрамя асоб, якія падазраваліся ў камунізме, дзейнічаюць члены тайнай арганізацыі тутэйшага павету «Бунд» [6, арк. 14, 18]. Сруль Тэненбаўм, член Брэсцкага акруговага камітэта Бунда, адказны за фінансавыя пытанні (неаднаразова выбіраўся ў члены Брэсцкай гарадской рады), у час першамайскай дэманстрацыі ў 1925 г. у Брэсце быў «вядомы мясцовай экспазітуры як камуністычны дзеяч, кінуў перад ваяводствам пачак камуністычных адозваў» [2, с. 104–105, 265]. Пад уплывам кампартыі ў Брэсце знаходзілася бундаўская маладзёжная арганізацы Югенд-Бунд Цукуфт [2, с. 113].

Патаемная, заканспіраваная арганізацыя «Бунд» магла ўзнікнуць у выніку ўзаемадзеяння легальных гурткоў Бунда з нелегальнымі арганізацыямі КПЗБ, якая была зацікаўлена ў пашырэнні свайго ўплыву за кошт уцягнення ў яе шэрагі рабочых, у тым ліку і яўрэйскіх. Атрымлівалася вельмі зручная для камуністаў сітуацыя, калі мясцовыя ячэйкі легальнай арганізацыі Бунд служылі своеасаблівым прыкрыццём для правядзення камуністычных акцый, напэўна, атрымліваючы некаторае фінансаванне з савецкага боку. Для самога Бунда гэта было небяспечным, бо магло стаць падставай для спынення дзейнасці партыі па падазрэнні ў антыдзяржаўнай дзейнасці. Відавочна, арганізатары камуністычнага падполля ў Заходняй Беларусі былі зацікаўлены ва ўцягненні ў яго бундаўцаў, у выкарыстанні магчымасцей легальнай партыі, не баяліся падставіць Бунд пад рэпрэсіі, якія маглі б прывесці да ажыўлення антыдзяржаўнай дзейнасці ў Польшчы, што было на руку бальшавіцка-камінтэрнаўскаму кіраўніцтву. Так у заходнебеларускім грамдстве камуністы штучна стваралі сітуацыю расколу, калі ў выніку рэпрэсій з боку дзяржаўных органаў незадаволенае насельніцтва ішло за камуністамі.

Стварэнне ў 1923 г. КПЗБ было выклікана жаданнем савецкага кіраўніцтва ўмацаваць сваю прысутнасць у Польшчы. Натуральна, становішча ў Заходняй Беларусі было зручнай падставай для бальшавіцкага кіраўніцтва выступаць у якасці абаронцы правоў прыгнечанага народа, а беларускі рух разглядваўся ў Маскве як сродак пралангацыі сваіх уплываў, пры дапамозе якога рэалізоўвалася бальшавіцка-камінтэрнаўская палітыка ў Польшчы. Менавіта ў такім кантэксце трэба разглядваць канчатковую рэалізацыю ідэі стварэння беларускай камуністычнай партыі ў Польшчы – КПЗБ, якая павінна была прыстасоўвацца да ўмоў грамадска-палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі, выкарыстоўваць існуючую сярод беларускага народа незадаволенасць, перацягваць на свой бок актыўныя элементы, навязваючы свае сацыяльна-класавыя каштоўнасці замест ідэй беларускага нацыянальна-вызваленчага характару. Стварэнне КПЗБ было тактычным крокам Камінтэрна для разгортвання больш шырокага і трывалага рэвалюцыйнага руху ў Польшчы ва ўмовах павелічэння ролі і месца беларускага фактара ва ўнутрыпалітычным жыцці Польшчы, відавочным сведчаннем чаго сталі вынікі выбараў у польскі сейм у 1922 г. Тады ў асобе сваіх выбраннікаў, дэпутатаў сейма, беларускія сяляне бачылі абаронцаў нацыянальных і сацыяльных інтарэсаў беларускага народа ў складзе Польшчы [27, с. 54]. КПЗБ паўстала відавочна, па выказванні А. Бергман, як «жыдоўская»

з-за таго, што яе касцяк складалі прадстаўнікі яўрэйскай нацыі. І для бальшавіцка-камінтэрнаўскага кіраўніцтва было не важна, якой па характары будзе КПЗБ: нацыянальнай ці тэрытарыяльнай; галоўнае было, каб партыя стала правадніком адпаведнай палітычнай лініі. Так што абедзьве партыі (КПЗБ і Бунд) збліжала наяўнасць у КПЗБ значнай колькасці кіруючых работнікаў, якія па нацыянальным паходжанні былі яўрэямі.

Верагодна, камуністычная арганізацыя беларускага кшталту магла паўстаць у выніку адпаведных захадаў беларускіх дзеячаў. Напрыклад, адзін з лідараў заходнебеларускіх камуністаў, а пазней беларускай нацыянальнай фракцыі ў КПЗБ, т.зв. сэцэсіі, «Стары» (Ясінскі, Тамашэўскі), пра якога ў літаратуры дзіўным чынам адсутнічае нават мінімальная інфармацыя біяграфічнага характару, яшчэ ў кастрычніку 1922 г. пратэставаў супраць перадачы Віленскай акруговай партыйнай арганізацыі, членам акруговага камітэта якой ён быў, у веданне КПРП. «Стары» настойліва выказваўся за стварэнне Камуністычнай партыі Сярэдняй Літвы на правах секцыі Камінтэрна, сувязь якой з КПРП павінна была быць заснавана на ўзгодненасці дзеянняў, а не на падпарадкаванні агульнаму цэнтральнаму кіраўніцтву [27, с. 50]. Магчыма, «Стары» і яго паплечнікі мелі канспіратыўныя сувязі з камуністычнымі дзеячамі ў БССР і планавалі яшчэ ў 1922 г. стварыць на базе кампартыі Сярэдняй Літвы самастойную, незалежную ад польскай кампартыі Камуністычную партыю Заходняй Беларусі. Больш таго, вядома, што БРА эвалюцыянавала ў камуністычны бок у выніку сувязей і супрацоўніцтва, якое ўсталявалася паміж ёй і Віленскім камітэтам КПРП [27, с. 72], а магчыма і беларусамі з ЦК КП(б)Б.

Беларускую камуністычную партыю ў Заходняй Беларусі лагічней было б арганізацыйна злучыць з КП(б)Б: яна мела вопыт арганізацыі антыпольскага змагання ў час польска-савецкай вайны, якое арганізоўвала разам Беларускай партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Вядомыя планы падрыхтоўкі і правядзення паўстання з мэтай аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР (як вынік трэба ўзгадаць рашэнні ІІ канферэнцыі КПЗБ [4]) і дзейнасць у БССР дзяржаўна-палітычных сіл па наладжванні антыпольскага змагання, магчыма, т.зв. Камітэта чыну [23, с. 319–327], патрабавалі нацыянальна арыентаванай беларускай кампартыі ў Заходняй Беларусі, якая, выкарыстоўваючы магчымасці КП(б)Б, магла б ажыццявіць названыя планы. Лідары БССР валодалі інтэлектуальнымі і інфармацыйнымі сродкамі, мелі значную фінансава-матэрыяльную базу інспірацыі і падтрымкі беларускага руху, сувязі з беларускімі непралетарскімі партыямі і іх лідарамі, напрыклад, эсэрамі, былі зацікаўлены ва ўмацаванні і кансалідацыі незалежніцкага беларускага руху ў Заходняй Беларусі, праводзілі агітацыю і прапаганду сярод беларускіх сіл, накіраваную на іх «палявенне». Таму, напэўна, існавалі планы па стварэнні нелегальнай беларускай камуністычнай арганізацыі ў Заходняй Беларусі на базе БРА. Беларускія эсэры пасля падпісання Рыжскай дамовы катэгарычна адмаўлялі яе, арганізоўвалі паўстанцкія атрады, абапіраліся на бэнээраўскія сілы ў Літве праз урад БНР, які ўзначальваў В. Ластоўскі [31, 19–21]. Гэта пэўным чынам тлумачыць лёгкасць, з якой заходнебеларуская партызанка, у тым ліку і эсэраўская, да сярэдзіны 1920-х гг. перайшла пад кантроль камуністаў з КПЗБ-КПП-Камінтэрна. Нездарма праз пэўны час у КПЗБ праявіла сябе т.зв. «сэцэсія» – выхадцы з БРА, якія не хацелі падпарадкоўвацца Маскве.

Верагодна, што пры арганізацыі беларускай кампартыі ў Заходняй Беларусі бальшавіцка-камінтэрнаўскае кіраўніцтва апярэдзіла ў гэтым беларускіх дзеячаў, беларусам не давярала, таму КПЗБ першапачаткова паўстала як «жыдоўская». Аднак новастворанай аўтаномнай адзінцы кампартыі Польшчы не хапала нацыянальнага каларыту, не было ніводнага члена ЦК КПЗБ, які свабодна валодаў бы беларускай мовай, партыя не мела падтрымкі сярод беларускага насельніцтва. Таму спатрэбіліся прымаць у свае шэрагі былых эсэраў – членаў БРА, магчымую ініцыятыву якой па стварэнні камуністычнай партыі перахапіў Камінтэрн. Разам з гэтым уліванне БРА ў КПЗБ – магчымая саступка

беларускім камуністам з КП(б)Б, якія пагаджаліся на «беларускасць» новастворанай партыі ўзамен на кааптаванне ў склад ЦК КПЗБ сваіх надзейных людзей. Гэта садзейнічала кансалідацыі камуністычных беларускіх і польскіх сіл, якія павінны былі супольна вырашаць задачы арганізацыі барацьбы «за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне», аднак мэты і накіраванасць беларускай фракцыі ў КПЗБ не супадалі з імкненнямі польскіх камуністаў, беларускія камуністы мелі свае нацыянальныя інтарэсы і праграмы.

Суперніцтва паміж КПП і беларускімі дзеячамі ў КПЗБ можна праназіраць на прыкладзе стасункаў двух устаноў, якія пэўным чынам характарызуюць адносіны паміж беларускім і польскім бакамі ў іх змаганні за КПЗБ, за Заходнюю Беларусь. Вядома, што ў хуткім часе пасля стварэння КПЗБ і ўваходжання ў яе склад БРА у ліпені 1924 г. пры садзейнічанні прадстаўніцтва ЦК КПРП пры Выканкаме Камінтэрна (са згоды І. Сталіна) з мэтай арганізацыі дапамогі КПЗБ было створана Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б («Закардоннае бюро») [19, арк. 6]. У яго склад уваходзілі вышэйшыя дзяржаўна-партыйныя дзеячы БССР, у тым ліку У. Ігнатоўскі, які да кастрычніка 1924 г. кіраваў тэхнічнай работай і арганізоўваў выкананне рашэнняў [9]. Асоба У. Ігнатоўскага і яго дзейнасць паказальныя: менавіта пад яго патранажам дзейнічаў М. Гурын-Маразоўскі (Ханевіч, «Ян», «Стах»), будучы правадыр «сэцэсіі», накіраваны рашэннем Бюро ЦК КП(б)Б ад 28 лютага 1924 г. у Заходнюю Беларусь і ўведзены ў склад ЦК КПЗБ, падтрымліваў сувязь з Замежным бюро ЦК КП(б)Б і асабіста з У. Ігнатоўскім, дасылаў туды лісты, атрымліваў дырэктывы, а ў канцы 1924 г. фактычна выконваў функцыі сакратара ЦК КПЗБ. М. Гурын-Маразоўскі і «сэцэсія», магчыма, са згоды У. Ігнатоўскага, мелі прамое дачыненне да выпрацоўкі і прыняцця на ІІ канферэнцыі КПЗБ курса на арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку да ўзброенага паўстання з мэтай аб’яднання Заходняй Беларусі з БССР – вызвалення з-пад Польшчы.

Пасля ўзнікнення ў складзе КПЗБ беларускай нацыянальнай фракцыі (сэцэсіі) у лютым 1925 г. Бюро дапамогі было скасавана. Замест яго было створана Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, якое працавала пад кіраўніцтвам Прадстаўніцтва КПП пры Выканкаме Камінтэрна ў Маскве і фактычна лічылася яго філіялам у Мінску. Гэта значыць, польскія камуністы, ліквідаваўшы сэцэсію, змаглі пазбавіцца значнай, часам вырашальнай ролі камуністаў-беларусаў, навязаць КПЗБ свой кантроль, выводзячы яе з-пад уплыву КП(б)Б, якая дэманстравала сваю незадаволенасць і патрабавала своечасовага інфармавання па пытаннях палітычнай работы ў Заходняй Беларусі [10].

Яскравым прыкладам суперніцтва і непаразумення паміж КП(б)Б і КПП з’яўляецца вострая перапалка вясной 1926 г., якая выяўляецца пры знаёмстве з перапіскай пад грыфам «зусім сакрэтна» паміж кіраўніцтвам Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б і Прадстаўніцтвам ЦК КПП пры Выканкаме Камінтэрна, прадстаўленых, з аднаго боку, А. Славінскім і С. Мілерам, і, з другога боку, В. Багуцкім. Акрамя скаргаў на парушэнне дамоўленасці паміж прадстаўнікамі КПП і КПЗБ у Маскве аб інфармаванні Польсекцыяй Выканкама Камінтэрна прадстаўніцтва КПЗБ у Мінску, якое выявілася ў затрымцы Прадстаўніцтвам КПП адпаведнай інфармацыі, друкаваных выданняў і перапіскі ЦК КПЗБ, якая выпадкова трапіла ў Польсекцыю і дайшла ў Мінск са спазненнем амаль на месяц, зварот з Мінска ад 23 сакавіка 1926 г. утрымліваў катэгарычную просьбу ўрэгуляваць гэтыя праблемы, а таксама «пытанне аб затрымцы грошай, дасланых намі (Прадстаўніцтвам КПЗБ. – *А.С.*) праз ЦК КПП у ЦК КПЗБ». У сваім адказе ад 26 сакавіка 1926 г. В. Багуцкі ў іранічным і павучальным тоне адказваў сваім візаві: «Скаргі Вашы на тое, што не атрымліваеце ніякай інфармацыі, ні на чым не абгрунтаваны… Не разумею, да чаго ўся гэтая істэрыка і катэгарычныя патрабаванні». Пры гэтым, «з камуністычным прывітаннем», нічога не сказаў пра грошы.

Такі нядобразычлівы адказ атрымаў дастаткова стрыманую і канструктыўную рэакцыю А. Славінскага, які 1 красавіка 1926 г. ў лісце да В. Багуцкама прапанаваў не кра-

нац тагo, «наколькі наш ліст быў істэрычным, аднак усё ж Вы не адказалі па сутнасці пастаўленых пытанняў. Па пытанні аб грошах, якія КПП не передавала КПЗБ, Вы зусім не згадалі, што Вы думаеце прадпрымаць, каб грошы, якія былі высланыя намі для КПЗБ праз ЦК КПП, былі вернуты КПЗБ». Рашучая пазіцыя А. Славінскага спрыяла таму, што ў рэшце рэшт праблема была вырашана: 13 красавіка 1926 г. з Мінска ў Прадстаўніцтва КПП таварышу Багуцкаму было адпраўлена паведамленне: «Ваш ліст ад 6.4.26 г. за № 329 атрымалі, гэтаксама і выданні. Паведамляем Вам, што намі атрыманы ліст з краю, у якім паведамляюць, што канфлікт з грашыма ўлагоджаны» [21, арк. 15, 18, 21–23, 28]. Такім чынам, паміж КПП і КПЗБ меліся непаразуменні фінансавага характару, кваліфікаваныя яго ўдзельнікамі як канфлікт.

Стварэнне КПЗБ у тым выглядзе, у якім яно адбылося, было на карысць польскім камуністам, якія атрымалі пэўны кантроль над беларускім рухам і маглі аказваць на яго вырашальны ўплыў. З другога боку, неабходна ўлічваць меркаванне Р. Лазько аб тым, што ў Маскве глядзелі на КПЗБ і рэвалюцыйны рух у Польшчы як на сродак і своеасаблівы рычаг, з дапамогай якога пры неабходнасці можна было аказваць уплыў на Польшчу падчас савецка-польскіх дыпламатычных гульняў [11, с. 202–203].

Відаць, КПЗБ стваралася ў кастрычніку 1923 г. у спешцы: у час узброенага паўстання ў Кракаве кіраўніцтва Камінтэрна «патрабавала ад Кампартыі Польшчы ўзначаліць кіраўніцтва паўстаннем і пачаць стварэнне чырвонай гвардыі, каб трансфармаваць паўстанне ў рэвалюцыю» [12, с. 271]. Таму бальшавіцкае кіраўніцтва пайшло на тактычны крок: каб перацягнуць на свой бок беларусаў, «замацавала» за КПЗБ тэрыторыю Віленшчыны, нягледзячы на савецка-літоўскі дагавор ад 12.07.1920 г., па якім Вільня і Віленшчына абяцаліся бальшавікамі Літве. Пазней літоўскія камуністы не раз аспрэчвалі рашэнне аб замацаванні Вільні і Віленшчыны за КПЗБ [26, 109–111]. Прызнанне Віленшчыны за беларускую этнічную тэрыторыю, канешне ж, уздымала патрыятычны настрой беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія спадзяваліся на канчатковае замацаванне з цягам часу Вільні і Віленшчыны за Беларуссю і больш лаяльна ўспрымалі камуністычную агітацыю. Гэтаму садзейнічала і палітыка беларусізацыі ў БССР. Польскія камуністы былі не супраць такога рашэння: яно «выводзіла» Віленшчыну з-пад літоўскага ўплыву і замацоўвала яе за КПЗБ. Пры гэтым польскія камуністы не гублялі кантролю за спрэчнай тэрыторыяй: ствараемая КПЗБ у выглядзе складовай часткі павінна была ўваходзіць у КПП.

КПЗБ стваралася як састаўная частка Кампартыі Польшчы – краіны, якая акупіравала этнічную беларускую тэрыторыю! Улічваючы вопыт 1920 г., калі спроба саветызацыі Польшчы толькі ўмацавала нацыянальнае адзінства ІІ Рэчы Паспалітай, ігнараваць патрыятызм польскіх камуністаў было немагчыма. Таму спадзяванні беларусаў на «польскі інтэрнацыяналізм» членаў КПП былі памылковымі, ён хутчэй за ўсё быў звычайнай маскіроўкай польскага шавінізму ў адносінах да беларусаў.

Кампартыя Польшчы ў адносінах да Заходняй Беларусі займала неадназначную пазіцыю, якая выяўляецца дзякуючы аналізу некаторых дакументаў КПЗБ. 5 лістапада 1924 г. Віленская акруговая канферэнцыя КПЗБ у сваім звароце да ЦК КПП разам з прывітаннем выказала пажаданне, «каб пастановы другога з'езда партыі аб аддзяленні Заходняй Беларусі ад Польшчы і далучэнні да Савецкай Беларусі больш рашуча былі праведзены ў жыццё» [1, с. 251–252]. Такія заявы, верагодна, рабіліся ў сувязі з магчымым нежаданнем польскіх камуністаў выпускаць з рук кантроль над Заходняй Беларуссю. У дадзеным выпадку трэба мець на ўвазе сітуацыю ў КПЗБ, калі яна ў канцы 1924 – пачатку 1925 гг. сіламі т.зв. «сэцэсіянераў» рыхтавалася да антыпольскага паўстання ў Заходняй Беларусі. Вядома, што з 1924 г. польскія камуністы дамагаліся спынення партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі. На думку Ю. Стасевіча, удзельніка заходнебеларускай партызанкі, усе беларусы з ЦК КПЗБ, з акругоў, сельскіх ячэек ад-

крыта выступілі супраць «расейскага і польскага камандавання». Але ў гэтай спрэчцы атрымала перамогу «маскоўская лінія» на згортванне партызанскага руху [32]. Такім чынам, польскія камуністы праявілі сябе сапраўднымі патрыётамі, прыклаўшы намаганні для арганізацыі зрыву антыпольскага па сутнасці выступлення КПЗБ.

Сёння немагчыма дакладна рэканструяваць тагачасныя падзеі з-за адсутнасці партыйных дакументаў, што ў значнай ступені тлумачыцца строгай канспірацыяй, якая патрабавалася пры арганізацыі падпольнай работы па лініі Камінтэрна за мяжой [12, с. 401]. Адзін з функцыянераў КПЗБ М.С. Арэхва адсутнасць дакументальных звестак аб рабоце I канферэнцыі КПЗБ тлумачыў тым, што яны згубіліся ва ўмовах падполля, а ўсе дадзеныя, якія яе тычацца, былі ўстаноўлены некалькі гадоў пазней у выніку апытання ўдзельнікаў канферэнцыі і з другіх дакументаў [22, с. 35]. У 1923 г. савецкае кіраўніцтва вырашыла падпарадкаваць КПЗБ Кампартыі Польшчы, а не даручыць КП(б)Б пашырыць сваю дзейнасць на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Адкрыты удзел КП(б)Б, а фактычна філіяла РКП(б), у арганізацыі падпольнага камуністычнага руху на тэрыторыі Польшчы, відавочна, быў непажаданы і кваліфікаваўся б як парушэнне V артыкула Рыжскай мірнай дамовы. Да таго ж тактычныя задачы бальшавіцкага кіраўніцтва па распальванні пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы патрабавалі апоры на больш моцную і аўтарытэтную КПП. Тэрыторыю Віленшыны вырашылі перадаць пад адносны кантроль КПЗБ, якая, выступаючы як пэўная частка беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, успрымалася больш пераканаўча, чым прадстаўнікі літоўскіх камуністычных арганізацый. Таму КПЗБ восенню 1923 г. «атрымала» тэрыторыю Віленшчыны, нягледзячы на тое, што 12.07.1920 г. у Маскве, як вядома, быў падпісаны савецка-літоўскі дагавор, па якім Вільня і Віленшчына абяцаліся бальшавікамі Літве – пакуль яшчэ не савецкай. Гэта было не што іншае, як пусты абяцанак беларусам. У 1939 г., калі пасля ліквідацыі польскай дзяржавы СССР трэба было ўмацоўваць свае пазіцыі ў Прыбалтыцы, Вільня і Віленшчына, якія гуртавалі беларусаў на барацьбу, была перададзена Літве. Пра Беларусь можна было не думаць: памяркоўныя беларусы (асабліва пасля рэпрэсій 1920–30-х гг.) не асмеліліся прынцыпова ставіць пытанне аб Віленшчыне.

**Заключэнне**

Развіццё камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гг, стварэнне КПЗБ, разгортванне ёй пад нацыянальнымі беларускімі сцягамі «барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне» павінна разглядацца ў цеснай сувязі з дзейнасцю Камінтэрна па распаўсюджванні сусветнай рэвалюцыі, у прыватнасці, усталявання свайго трывалага ўплыву ў Польшчы і Заходняй Беларусі. У гэтым кантэксце трэба больш пільна вывучаць гісторыю ўзаемаадносін КП(б)Б з КПП, КПЛ, яўрэйскімі партыямі, у першую чаргу Бундам.

Тое самае тычыцца беларускіх партый і арганізацый, асабліва БПС-Р і БРА, іх дзейнасці па арганізацыі партызанскага руху, асэнсавання па-зіцыі іншых беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, якія не падтрымлівалі камуністычнай ідэалогіі, але былі перакананымі прыхільнікамі незалежнасці Беларусі, яе тэрытарыяльнай цэласнасці, па прынцыпова важкіх для беларускага нацыянальна-вызваленчага ішлі на супрацоўніцтва з КПЗБ. Наяўныя дакументальныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў розных архівах Беларусі, Польшчы і Расіі, ставяць актуальным ажыццяўленне паглыбленага манаграфічнага даследавання, накіраванага на выяўленне больш аб’ектыўнай і ёмістай карціны ўсталявання камуністычнага ўплыву на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гг.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за свое социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР : документы и материалы : сб. : в 2 т. / сост.: В.Н. Жигалов [и др.] ; под ред. В.И. Гурского, Н.С. Орехво, В.А. Полуяна. – Минск : Госиздат БССР, 1962. – Т. 1: 1921–1929. – 620 с.

2. Брест в 1919–1939 гг. : документы и материалы / сост.: А.Г. Карапузова [и др.] ; гл. ред. Е.С. Розенблат. – Брест : Альтернатива, 2009. – 308 с.

3. Валевіч, І.Р. Першыя гады Кампартыі Заходняй Беларусі. Успаміны падпольшчыка. 1921–1925 гг. / І.Р. Валевіч. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1935. – 48 с.

4. Грамовіч, У. Гурын-Маразоўскі Міхаіл Іванавіч / У. Грамовіч, Т. Процька // ЭГБ : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. – С. 178.

5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДзАБВ). – Фонд 92. – Воп. 1. – Спр. 108. Следственное дело на граждан, обвиненных в коммунистической деятельности.

6. ДзАБВ. – Фонд 92. – Воп. 1. – Спр. 109. Следственное дело на граждан, обвиненных в коммунистической деятельности.

7. Коминтерн против фашизма : Документы. – М. : Наука, 1999. – 505 с.

8. Корчык, П. Нацыянал-апартунізм у КПЗБ і ідэалагічная спадчына «Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі» / П. Корчык // Бальшавік Беларусі. – 1934. – № 7. – С. 35–43.

9. Ладысеў, У. Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б / У. Ладысеў // ЭГБ : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 154.

10. Ладысеў, У. Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б / У. Ладысеў // ЭГБ : у 6 т. – Мінск : БелЭн,1999. – Т. 5. – С. 559–560.

11. Лазько, Р.Р. Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг.) / Р.Р. Лазько. – Мінск : БДУ, 2000. – 354 с.

12. Линдер, И. Красная паутина: тайны разведки Коминтерна, 1919–1943 / И. Линдер, С. Чуркин. – М. : РИПОЛ классик, 2005. – 686 с.

13. Мощук, А.В. Деятельность Бунда на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. : дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А.В. Мошчук. – Минск, 2007. – 127 л.

14. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 10. Протоколы заседания бюро нелегальной работы при Центральном бюро КП(б) Белоруссии (1.III. – 21. VI. 1921 г.).

15. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 11. Переписка секретного отдела Центрального Бюро КП(б) Белоруссии с Белостокским окружным комитетом КП(б) Белоруссии о положении в Белостоке, по персональным и другим вопросам (02.04.1921 – декабрь 1922).

16. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 12. Переписка секретного отдела Центрального Бюро КП(б) Белоруссии с (уполномоченным отдела в Бресте) о положении в Брестской организации КП(б)Б (17.02. – 17.07.1921 г.).

17. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 13. Переписка секретного отдела Центрального Бюро КП(б) Белоруссии с ЦК Бунда о направлении членов партии на подпольную работу, о разрешении на выезд в Польшу и переход госграницы и по др. вопросам (1921 г).

18. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 29. Переписка Виленского окружного комитета Компартии Западной Белоруссии с ЦК КПЗБ о партийной работе и по персональным вопросам (1923–1924).

19. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 32. Переписка Представительства Компартии Западной Белоруссии с ГПУ Белоруссии и разными лицами о революционном движении в Западной Белоруссии; письмо члена ЦК Компартии Польши в Политбюро ЦК РКП(б) о создании бюро помощи Компратии западной Белоруссии.

20. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 44. Отчет Представительства ЦК Компартии Западной Белоруссии о работе за период с 15 апреля по 15 ноября 1925 года (2-й комплект, неполный).

21. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 80. Переписка представительства Компартии Западной Белоруссии с Представительством Компартии Польши при ИККИ по организационным вопросам и о партийных кадрах (февраль – 31.12.1926 г.).

22. Орехво, Н.С. Образование КПЗБ, ее организационное строение, формы и методы работы / Н.С. Орехво // В авангарде революционной борьбы : материалы науч.-теорет. конф., посвящ. 50-летию образования КПЗБ и КСМЗБ, 29 нояб. 1973 г. – Минск : Беларусь, 1974. – С. 33–49.

23. Пашкевіч, А.Ф. Атаман Дзяргач: невядомыя старонкі біяграфіі, ці да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху / А.Ф. Пашкевіч, А.М. Чарнякевіч // Берасцейскі хранограф : зб. навук. прац. – Брэст : Академия, 2004. – Вып. 4. – С. 314–334.

24. Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) и Коминтерн, 1919–1943 : Документы / Федер. арх. служба России, Рос. гос. арх. соц.-полит. истории. – М. : Росспэн, 2004. – 958 с.

25. Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине. – Минск : Изд-во Бел. Акад. наук, 1935. – 335 с.

26. Революционное движение в Вильнюсском крае: 1920–1940 гг. : Документы и материалы / под ред. Р. Малюкявичюса [и др.]. – Вильнюс : Минтис, 1978. – 448 с.

27. Революционный путь Компартии Зап. Белоруссии (1921–1939 гг.) / А.Н. Мацко [и др.] ; под ред. А.Н. Мацко и В.Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.

28. Савіч, А.А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А.А. Савіч ; навук. рэд. А.А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

29. Савіч, А.А. Праблема дзяржаўнай прыналежнасці Віленшчыны ў ідэалогіі камуністычнага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. (гістарыяграфія праблемы) / А.А. Савіч // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманітарных навук. – 2011. – № 1. – С. 54–59.

30. Сляшынскі, В. Барацьба дзяржаўных органаў зь беларускай дывэрсійнай дзейнасьцю на паўночна-ўсходніх землях міжваеннай Польшчы (1920–1925) / В. Сляшынскі. – АРХЭ Пачатак. – 2007. – № 1–2. – С. 114–146.

31. Сорокин, А.А. Революционное и освободительное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Изд-во БГУ, 1970. – 171 с.

32. Стасевіч, Ю. Партызанка Заходняй Беларусі / Ю. Стасевіч // Пагоня. – 1995. – 17–23 сак., 24–30 сак.

33. Фирсов, Ф. Секретные коды истории Коминтерна, 1919–1943 / Ф. Фирсов. – М. : Крафт+, 2007. – 568 с.

34. Цынкевіч, В.М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай Рэспублікай у 1921–1929 гг. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.15 / В.М. Цынкевіч ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2004. – 127 с.

***Savich A.A.*** **Communist Movement in Western Belarus in Early 1920 and Formation of CPWB: Historiographic Discourse**

The article written on a wide range of historiographical sources and archival documents, analyzes the process of scientific research into the history of the communist movement in Western Belarus in the early 1920s and the the creation of Communist Party of Western Belarus. The author draws attention to the conditionality of the communist movement by the desire of Bolshevik-Comintern forces to expand and strengthen their influence in the region, specifies the organizational and personnel and logistical aspects of the appropriate action. The cooperation of CP(b)B with the Bund, which with the assistance of the party-state structures of the BSSR shipped to Poland of its members played an important role importance in the establishment of communist influence according to a number of reasons.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 27.06.2013